# УСХОДНІ НАПРАМАК ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ПОЛЬШЧЫ Ў ПАЛІТЫЧНЫХ КАНЦЭПЦЫЯХ 1918–1921 гг.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

А. Г. Трубчык (Мінск)

Усходняя палітыка незалежнай Польскай дзяржавы фарміравалася пад уплывам розных палітычных канцэпцый, якія знайшлі сваё адлюстраване ў польскім друку і асобных брашурах праграмнага характару. У 1920-я гг. вывучэнне этнаканфесійных і дэмаграфічных характарыстык "усходніх крэсаў" становіцца прыярытэтным накірункам польскай гістарычнай навукі. У гэты перыяд з'яўляюцца статыстычныя працы Э. Малішэўскага [6], У. Студніцкага [10], Л. Васілеўскага [11], С. Кучэбы [4], К. Саракоўскага [9], якія зыходзілі з даных перапісу насельніцтва, праведзенага ў Польшчы ў канцы верасня 1921 г.

У 1923 г. па загаду тагачаснага прэм'ер-міністра Уладзіслава Сікорскага была падрыхтавана навуковая праца польскага даследчыка Канстанты Саракоўскага "Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich" ("Нацыянальная справа на ўсходніх крэсах"). Галоўнай мэтай аўтара было вызначыць этнаканфесійныя асаблівасці краю і ахарактарызаваць узровень яго эканамічнага і культурнага развіцця. Не адмаўляўся той факт, што на гэтых землях яшчэ да пачатку польскага наступлення мела месца беларуская адукацыя, арганізаваная пры падтрымцы нямецкіх акупацыйных улад.

Аўтар зрабіў выснову аб тым, што ў заняпадзе беларускай асветы ў час польска-савецкай вайны вінавата не мясцовае насельніцтва з яго слабай нацыянальнай інтэлігенцыяй, а перш за ўсё, непаслядоўнасць палітыкі кіраўніцтва Генеральнага камісарыята Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель (далей – ГУУЗ). Так, у пачатку польскага наступлення на беларускія землі ваенныя ўлады знішчылі амаль усе беларускія школы, якіх толькі на Гродзеншчыне было каля 153. Калі ўсе беларускія школы былі зачынены, кіраўніцтва ГУУЗ пачало падрыхтоўку беларускіх настаўнікаў. На педагагічных курсах у Вільні і Слуцку навучалася паўтары тысячы беларускіх настаўнікаў, якія так і не былі прызначаны на пасады. Застаўшыся без працы, яны пачалі займацца беларускай або камуністычнай прапагандай. Такім чынам, польскія ўлады самі падрыхтавалі сабе ворагаў. На думку К. Саракоўскага, дазвол бескантрольнай дзейнасці мясцовай адміністрацыі ГУУЗ быў галоўнай памылкай польскай палітыкі.

У 1928 г. выйшла адна з найбольш значных прац, якую можна аднесці як да польскай гістарыяграфіі міжваеннага перыяду, так і да крыніц па вывучэнню польскай палітыкі на акупаваных землях – "Кароткі нарыс беларускага пытання", падрыхтаваная ў II аддзеле Генеральнага штаба польскага войска (аўтарства невядома) і прызначаная "толькі для службовага карыстання" [1].

Рэпазіторый ВДУ

У працы дадзена ацэнка польскай палітыкі на беларускіх землях, акрэслены адносіны насельніцтва да польскіх ўлад, а так сама вызначаны асаблівасці беларуска-польскіх дачыненняў. “Кароткі нарыс…” змяшчае інфармацыю аб тым, што Віленская адозва выклікала паланафільскія настроі ў часткі беларускага грамадства. Сярод беларускіх нацыянальных дзеячаў з’явіліся прыхільнікі вырашэння палітычнага лёсу Беларусі ў федэрацыі з Польшчай. Аднак хутка польскае кіраванне стала непапулярным. Прычыну аўтар бачыў у тым, што польскія ўлады дзейнічалі на беларускіх землях як ў акупаваным краі, не лічыліся з настроямі і інтарэсамі насельніцтва, не мелі рашучай і паслядоўнай нацыянальнай палітыкі.

З пачатку 1930-х гг., у сувязі з уздымам нацыянальна-вызваленчага руху, выкліканага глыбокім эканамічным крызісам, у польскую гістарыяграфію зноў вярнуліся антыбеларускія тэндэнцыі. З’явіліся працы, якія замацоўвалі лінію погляду на беларускі народ, як на адсталы ў нацыянальным развіцці і няздольны да самастойнай дзяржаватворчасці.

У 1970-я гг. ў польскай гістарыяграфіі ў першыню прагучала думка аб тым, што ў адносінах да беларускіх зямель на практыцы польскія ўлады не кіраваліся адзінай палітычнай праграмай [2; 5]. Палітыка, якая ў тэорыі павінна была быць федэрацыйнай, рэалізоўвалася згодна з інкарпарацыйнай мадэллю. У публікацыях Ю. Левандоўскага і А. Дзяругі упершыню ў польскай гістарыяграфіі прагучала думка аб тым, што ў адносінах да беларускіх зямель на практыцы польскія ўлады не кіраваліся адзінай палітычнай праграмай. Палітыка, якая ў тэорыі павінна была быць федэрацыйнай, рэалізоўвалася згодна з інкарпарацыйнай мадэллю. Ю. Левандоўскі ў працы “Федэралізм. Літва і Беларусь у палітыцы бельведэрскага лагера (1918–1920 гг.)” пісаў: “Абедзьве [польскія] праграмы прадугледжвалі экспансію на ўсход… Увод войскаў адбываўся для ўключэння ўсходніх тэрыторый у склад Польшчы ў інтарэсах польскай меншасці, сярод якіх вядучую ролю адыгрывалі землеўласнікі, звязаныя з адміністрацыяй ГУУЗ” [5]. На думку аўтара, агульныя палітычныя дырэктывы федэралістаў і эндэкаў найбольш збліжаліся ў вырашэнні беларускіх пытанняў.

На думку польскага даследчыка П. Урубеля, беларускі нацыянальны рух не меў уплыву на мясцовае насельніцтва, таму няўпэўненыя ў сваім палітычным становішчы беларускія лідары “фармулявалі да палякаў вельмі абмежаваныя патрабаванні гаспадарчага і культурнага плану [12]. Характарызуючы польска-беларускія адносіны, аўтар падкрэслівае, што польскія ўлады, назіраючы раз’яднанасць і слабасць маладога беларускага нацыянальнага руху, не маглі ставіцца да яго сур’ёзна. Разам з тым, даследчык не ідэалізуе польскую палітыку, робячы выснову аб тым, што палякі паводзілі сябе ў Беларусі як у акупаваным краі. На распаўсюджванне антыпольскіх настрояў сярод беларускай інтэлігенцыі значна паўплывала недальнабачная палітыка мясцовай адміністрацыі,

Рэпазіторый ВГУ

накіраваная на паступовае закрыццё ўсіх беларускіх школ, якія пакінулі пасля сябе немцы (дадзена лічба 350 беларускіх пачатковых школ).

З пачатку 1990-х гг. у польскай гістарычнай навуцы наступленне польскіх войскаў на беларускія тэрыторыі пачало вызначаецца як "вызваленне ўсходніх зямель ад бальшавізму". У большасці сучасных навуковых прац і падручнікаў па гісторыі Польшчы для характарыстыкі дзейнасці польскіх ваенных улад на занятых тэрыторыях не ўжываецца тэрмін "акупацыя".

Працы Г. Лукомскага, В. Бальцэрака, А. Новака, М. Вайніцкай, Е. Тапольскага, М. Лечыка і інш., прысвечаных "усходняй праблематыцы" і беларуска-польскім адносінам у 1919–1921 гг. аб'ядноўвае зварот да падтрымкі федэрацыйнай канцэпцыі Ю. Пілсудскага, згодна з якой вынікала, што толькі дзякуючы польскаму ваеннаму наступленню беларусы атрымалі рэальную магчымасць стварыць уласную дзяржаўнасць у федэрацыі з Польшчай.

У апошняе дзесяцігоддзе ў польскай гістарыяграфіі акрэсліўся навуковы кірунак, прадстаўнікі якога, на наш погляд, перабольшваюць ролю федэралiскай ідэі ў польскай палітыцы на акупаваных землях. Разам з ідэалізацыяй федэралiскай канцэпцыі Ю. Пілсудскага назіраюцца спробы абгрунтаваць прычыны яе правалу [8]. Вядомы спецыяліст па вывучэнню польскай палітыкі на тэрыторыі ГУУЗ прафесар Ю. Героўская-Калаўр прыйшла да высновы аб тым, што Ю. Пілсудскі не здолеў ажыццявіць свой палітычны праект на тэрыторыі ГУУЗ, бо не меў там адзінадумцаў, здольных да зладжанай працы. Мясцовая адміністрацыя ГУУЗ была слаба арганізаваная, а большасць з яе прадстаўнікоў мелі інкарпарацыйныя погляды на будучае ўладкаванне краю.

Адной з прычын зрыву федэралiскіх планаў Ю. Пілсудскага Ю. Героўска-Калаўр лічыць дзейнасць Таварыства Стражы Крэсовай (далей – ТСК). На думку даследчыцы, дадзеная арганізацыя павінна была стаць апорай федэралістаў, аднак дзейнасць яе арганізатараў і асобных функцыянераў пайшла ўразрэз з дэкларыванай палітыкай Ю. Пілсудскага. У артыкуле "Стража Крэсова адносна беларускага пытання" даследчыца адзначае, што ТСК не падтрымлівала дзейнасць беларускага нацыянальнага руху. Пры гэтым вельмі спрэчнай падаецца аўтарская заўвага аб тым, што "нікога з гэтага асяродка нельга было назваць беларусафобам" [3]. Ю. Героўска-Калаўр абмінула ўвагай факты супрацьдзеяння адкрыццю беларускіх школ з боку інструктараў ТСК, асабліва на Віленшчыне і Гродзеншчыне. Аўтар выказала думку аб тым, што ТСК чэрпала сродкі з фінансавага фонду ГУУЗ, а значыць павінна была працаваць пад лозунгамі Віленскай адозвы.

Дадзеную пазіцыю не падтрымлівае Ніна Зелінска, аўтар манаграфіі "Таварыства Стражы Крэсовай, 1918–1927." Даследчыца сцвярджае, што з самага пачатку ТСК не мела адзінага палітычнага кірунку, аднак дзейнасць яе прадстаўнікоў заўсёды была "гарантыяй польскага характару ўсходніх

Репозиторий ВГУ

зямель” [13]. Н. Зелінска падкрэслівае, што ТСК была важнейшай грамадска-палітычнай арганізацыяй, дзякуючы якой удалося схіліць на бок Польскай дзяржавы большую частку насельніцтва шматнацыянальных ўсходніх земель. Таму галоўнай крыніцай грашовых сродкаў для ТСК было не ГУУЗ, а ахвяраванні з боку мясцовага насельніцтва. Высновы аўтара грунтуюцца на матэрыяле архіўнага фонду ТСК, пры гэтым даследчыца не выкарыстоўвае дакументы ГУУЗ. У сувязі з гэтым назіраецца перабольшванне значэння ТСК у грамадска-палітычным жыцці акупаваных тэрыторый, адсутнічае інфармацыя аб дачыненнях з адміністрацыяй ГУУЗ, не акрэслена пазіцыя ТСК адносна культурна-асветніцкай дзейнасці беларускіх арганізацый і інш.

У апошнія гады палітыка польскіх улад у 1919–1921 гг. разглядаецца праз прызму вывучэння беларуска-польскіх адносін. Найбольш значнай сярод сучасных напрацовак неабходна адзначыць манаграфію польскай даследчыцы Дароты Міхалюк “Беларуская Народная Рэспубліка 1918–1920: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці”. У 2015 г. праца была перакладзена на беларускую мову [7].

Аўтар дэталёва прааналізавала прычыны расколу беларускага нацыянальнага руху, вызначыла пазіцыі розных яго плыняў. У даследаванні адзначана, што польскія ўлады не падтрымлівалі незалежніцкія памкненні беларусаў, а іх надзеі на ўтварэнне дзяржавы выкарыстоўвалі ва ўласных мэтах. Аднак палякі не хацелі давесці справу да сітуацыі, калі беларускія палітыкі будуць шукаць падтрымкі ў Савецкай Расіі, тым больш, што не было вырашана пытанне польскай усходняй мяжы.

На думку даследчыцы, праблема беларуска-польскіх адносін заключалася ў узаемным недаверы і няшчырасці дыскусій. З беларускага і польскага бакоў па-рознаму разумелася ідэя беларускага П’емонта пад апекай Польшчы. А. Луцкевіч настойваў на ідэі непадзельнасці Беларусі і разумеў яе як згоду Ю. Пілсудскага на стварэнне беларускай тэрытарыяльнай і палітычнай аўтаноміі. У сваю чаргу, Ю. Пілсудскі абяцаў перадаць беларусам тэрыторыі, якія, акрамя Міншчыны, знаходзіліся пад савецкай уладай. Уваходжанне ў склад беларускай дзяржавы Віленшчыны і Гродзеншчыны не абмяркоўвалася, бо Ю. Пілсудскі лічыў іх часткай Польшчы. Гэта пазіцыя выразна праявілася ў лаяльнасці да беларускай мовы і адукацыі на Міншчыне. Разам з тым, на Віленшчыне і Гродзеншчыне са 150 беларускіх школ, якія дзейнічалі падчас нямецкай акупацыі, засталося толькі 20. Польскія ўлады зачынілі гімназіі ў Будславе, Гродна, а ў Слуцку і Вільні абмежавалі іх дзейнасць [7].

Падагульняючы свае высновы, Д. Міхалюк сцвярджае, што калі б беларускі нацыянальны рух не раскалоўся, ён меў бы большую прабіўную сілу і магчымасць дасягнуць сваіх мэт, калі і не ў справе дзяржаўнай незалежнасці, то абавязкова сферы асветы.

Репозиторий ВГУ

Такім чынам, праблемы, звязаныя з дзяржаватворчымі працэсамі, застаюцца актуальнымі, патрабуюць аб'ектыўнага навуковага падыходу и далейшай распрацоўкі з боку як польскіх, так і беларускіх гісторыкаў.


1. Кароткі нарыс беларускага пытання. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 396 с.
2. Deruga, A. Polityka wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Białorusi i Ukrainy (1918–1919) / A. Deruga. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1969. – 330 s.
3. Gierowska-Kałłaur, J. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego – 9 września 1920) / J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa : Wydawnictwo Neriton Institut Historii PAN, 2003. – 447 s.;
4. Kutrzeba, S. Polska odrodżona, 1914–1922 / S. Kutrzeba. – Krakow : Gebethner i Wolff, 1922. – 20 s.
5. Lewandowski, J. Fedaralizm. Litwa a Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI-1918–IV-1920) / J. Lewandowski. – Warszawa : PWN, 1962. – 79.
6. Maliszewski, E. Białoruś w cyfrach i faktach / E. Maliszewski. – Piotryków : Wiadomości Polski, 1918. – 39 s.; Maliszewski, E. Stosunki narodowościowe w Rżeczypospolitej Polskiej / E. Maliszewski. – Warszawa : Instytut badań spraw narodowościowych w Polsce, 1923. – 20 s.
7. Michaluk, D. Białoruska Republika Ludowa 1918–1919. U podstaw Białoruskiej państwowości. – Toruń : Wyd-wo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2010. – 597 s.
8. Sleszyński, W. Wychować lojalnych obywateli. Polityka oświatowa władz polskich na ziemiach północhno – wschodnich II Rzeczypospolitej (1919–1939 ) / W. Sleszyński // Rola oświaty i szkolnictwa w procesie kształtowania się świadomości narodowej na pograniczu polsko-litewskim-białoruskim / Prymat; red. W. Sleszyński. – Białystok, 2007. – S. 151–158.
9. Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Kraków : Gebethner i Wolff, 1924. – 56 s.
10. Studnicki W. Zarys statystyczno-ekonomiczny ziem północzno-wschodnich / W. Studnicki. – Wilna, 1922. – 165 s.; Studnicki, W. Pólnocno- wschodnie ziemie dawnej Rżeczypospolitej Polskiej / W. Studnicki. – Warszawa, 1919. – 27 s.
11. Wasilewski, L. W sprawie przyłączenia kresów wschodnich / L. Wasilewski. – Warszawa : Znak, 1919. – 26 s.
12. Wróbel, P. Kształtowanie się białoruskiej świadomości a Polska / P. Wróbel. – Warszawa : Wydawnictwa Uniwesitetu warszawskiego, 1990. – 86 s.
13. Zelińska, N. Towarzystwo Straży Kresowej, 1918–1927 / N. Zelińska. – Lublin : VERBA, 2006. – 243 s.


Репозиторий ВГУ

## «ТЕХНИКА ГОСТЕПРИИМСТВА»: ДОКУМЕНТЫ ВСЕСОЮЗНОГО ОБЩЕСТВА КУЛЬТУРНОЙ СВЯЗИ С ЗАГРАНИЦЕЙ О РАБОТЕ С «ГОСТЯМИ СССР» ИЗ ЧИСЛА ЗАПАДНОЙ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ В 30-е гг. XX в.

И. В. Жилинская (Минск)

В 1981 г. в Нью-Йорке вышла книга П. Холландера «Политические пилигримы: путешествия западных интеллектуалов по Советскому Союзу, Китаю и Кубе (1928–1978)», в которой автор, анализируя визиты представителей западной интеллигенции в указанные страны, вводит понятие «техника